Вялікія сакрэты

Мастак
Ганна Сілівончык

Карціны ў апавяданнях

Прадмова

Увесь час мне да галавы прыходзяць думкі і ідэі. Бывае так, што гэтым фантазіям робіцца цесна, і яны просяцца на свет. Тады я бяру вялікі чарпак, чэрпаю ім натхненне з адмысловай крыніцы і разліваю яго ў дзве шклянкі. Першая — для сябе, а другая — для Музы, якая заўжды наведвае мяне ў такія моманты.

Натхненне, калі хто не каштаваў, на смак нагадвае кампот, толькі яно сіняе і пахне ландышам. Але галоўнае тут — пра закуску не забыць. Імбірныя пернікі — самае тое. Муза іх вельмі любіць. Потым я малюю, а Муза сядзіць і глядзіць, частуецца і захапляецца.

Так мой унутраны свет выплёскваецца з мяне на палатно, і нараджаюцца размаітыя творы мастацтва.

Selivanchik 2010

Дарэчы, пра птушак

У сне я заўжды лётаю. Як птушачка. Аднойчы тата сказаў, што калі лётаеш у сне, значыць, расцеш. Але я неяк не вельмі расту. Затое вельмі лётаю. А бабуля сцвярджае, што калі не буду есці кашу — не вырасту. Але ж я ем кашу. Штoранку. Праўда, пакрышачку. Як птушка.

А вось мой дзядуля лічыць, што я ўвесь час сакачу, як куранятка. Але гэта няпраўда. Бывае, я маўчу. Дык вось, часам хочацца кінуць усё: і дом, і школу, і кашу — і паляцець у вырай… А мама кажа, што я гора чубатае, і ласкава называе мяне “мая птушачка”.

Silivonchik 2010

Пра Люду і людаеда

Жыла сабе дзяўчынка Люда. Пайшла яна аднойчы на шпацыр. Ідзе сабе, а насустрач ёй галодны людаед. Пабачыў ён Люду і ўзрадаваўся:

— Банжур, мадам! Дазвольце прадставіцца — людаед Вася. Прабач, але давядзецца мне цябе з'есці.

— А я людаед Люда, — не разгубілася дзяўчынка. — Таксама не супраць падмацавацца.

Спалохаўся людаед і кажа:

— Хіба ты не ведаеш, што Мінздароўя не рэкамендуе есці нямытых людаедаў? Што на нямытых людаедах жывуць мільёны шкодных мікробаў? Давай я лепей хуценька збегаю памыюся, добра?

Схітрыць вырашыў.

— Добра, — кажа Люда. — Я таксама пайду памыю рукі. Сустракаемся праз дзесяць хвілінаў на гэтым жа месцы.

Ці варта казаць, што ніводзін з іх на гэтае месца так і не вярнуўся.

Sylvonchik. 2010.

Анёлы

У кожнага чалавека ёсць свой добры анёл. Анёлы гэтыя жывуць на аблоках, ходзяць у белых шкарпэтках і ядуць белы зефір. І з аблокаў сваіх за людзьмі назіраюць у бінокль. Гэта іх асноўная праца. І ўсё, што бачаць, запісваюць у спецыяльныя кніжачкі. А потым падлічваюць, колькі кожны чалавек добрых і дрэнных учынкаў за ўсё жыццё нарабіў.

Калі чалавек, у якога добрых учынкаў аказалася больш, трапляе на неба, яму таксама белыя шкарпэткі і бінокль выдаюць. А тым, хто дрэнных учынкаў больш нарабіў, выдаюць кажух і рыдлёўку. Такія на навальнічных і снежных хмарах жывуць. Дзень пры дні там падлогі мыюць і снег чысцяць. А замест белага зефіру ў іх манная каша і малако з пенкай.

2010.

З жыцця чараўніц

Жыла сабе самая звычайная маленькая чараўніца. Не было ў ёй нічога адметнага. Чараўніца як чараўніца. І бацькі ў яе былі самыя звычайныя. Тата — просты маг, а мама — звычайная чарадзейка. Жылі яны ў самай звычайнай чароўнай краіне. Дзе, як і мае быць, штодзень адбываліся тысячы шараговых цудаў і чарговых фантастычных пераўвасабленняў. Нудота, адным словам.

Але нашай чараўніцы хацелася чагосьці гэткага незвычайнага, асаблівага. А дзе ж яго возьмеш? Так і пражыла яна сваё доўгае і шчаслівае шэрае нічым не прыкметнае чароўнае жыццё, не напаткаўшы нічога цікавага. Проста не пашэнціла, напэўна.

Schwochuk 2010.

Мой конь

Конь і зручны, і практычны,
Даўганогі, сімпатычны,
Ды яшчэ і эстэтычны
І страшэнна рамантычны.
Спаць заўсёды конь мой мог
На нагах без задніх ног.
Коні не ядуць халву,
А ядуць адну траву.
Коні ездзяць без бензіну —
Не патрэбны коням ён.
Можна ездзіць без бензіну
Ў госці ці на стадыён.
Я хачу каня прадаць,
Колькі хто гатовы даць?
Налятайце ж, ну, смялей!
Я тады куплю "Харлей".



Silivonchik. 2009

Кепская казка

Сустрэў аднойчы адзін кепскі чалавек другога кепскага чалавека. Другі кепскі чалавек кепска паглядзеў на першага. А першы ў адказ назваў другога кепскім словам. Другі кепскі чалавек таксама ведаў шмат кепскіх словаў і за імі ў кішэню не палез. Тады першы кепскі чалавек проста ўзяў і ўтнуў другога кепскага чалавека ў нос. Другі кепскі чалавек не прымусіў сябе чакаць і даў першаму кепскаму чалавеку поўху. Так два кепскіх чалавекі мутузілі адно аднаго, пакуль ім абодвум не стала зусім кепска. Тады іх забралі ў кепскую лякарню, дзе іх лячылі кепскія дактары. І скончылі яны кепска.

Silvonchik. 2008.

Цудоўная казка

Адным цудоўным ранкам аднаго цудоўнага дня прачнулася адна цудоўная дзяўчына і давай упрыгожвацца. Рэч у тым, што ў яе было цудоўнае пачуццё, што вось-вось з ёй павінна адбыцца нешта вельмі цудоўнае. І яно, вядома, неадкладна адбудзецца. Як толькі яна выйшла на двор уся такая ладненькая-цудоўненькая, дык адразу сустрэўся ёй адзін цудоўны і вельмі прыстойны прынц. Адразу ў яе закахаўся і давай прапанову рабіць. Прапанаваў руку і сэрца і шмат яшчэ якіх цудаў. А яна збянтэжылася і кажа:

— Цудоўна, я падумаю.

Silivonchik 2010

Дзіўная казка

Адзін кароль быў вельмі няпамятлівы. Аднойчы нават згубіў ключы ад каралеўства. Давялося потым лезці праз фортку.

Ці, да прыкладу, пойдзе ён вайной на суседняе каралеўства, а па дарозе забудзе, навошта ішоў. Сядзе тады з суседнім каралём, пап'е гарбаты з пернікамі і назад дадому адправіцца.

А яшчэ ён заўжды забываў жонку сваю, каралеву, з днём народзінаў павіншаваць. Але, на шчасце, жонка ягоная таксама была незлапамятлівая. Бывае, палаюцца, пакрыўдзяцца, а назаўтра ўжо забудуцца на ўсё і давай цалавацца нібыта нічога ніякага.

А вось да чаго я вам гэтую гісторыю расказваю, я і сама, прызнацца, дрэнна памятаю.

Slovenčík 2007

Вялікі сакрэт

— А ведаеш, Дзеда Мароза не існуе! Калі не верыш, сам прапільнуй, хто табе ноччу падарункі пад ёлку кладзе, — тлумачыў суседскі хлопчык Ягорку.

Вось Ягорка і наважыўся на навуковы эксперымент. У навагоднюю ноч зрабіў выгляд, што моцна спіць, а сам ціхутка паглядаў, што будзе.

Выявілася, што Дзед Мароз — гэта тата Ягоркаў! Увесь год ён звычайным татам прыкідваецца, а ў навагоднюю ноч спяшаецца ўсім дзецям падарункі даставіць.

Але гэта вялікі сакрэт. Ведаць яго нікому не варта. Асабліва суседскім хлапчукам. Бо як даведаюцца ўсе, што Ягоркаў тата і ёсць Дзед Мароз — адразу набягуць рэпарцёры, журналісты, і бывай, спакойнае жыццё.

Ягорка засынаў і думаў: “Вырасту — буду Дзедам Марозам, як тата”.

Хачу спяваць

Я так хачу на пяць спяваць!
Калі пачну спяваць на пяць,
То буду я для ўсіх спяваць
І добрым спевам забаўляць,
Калі пачну спяваць на пяць.
І будуць мною захапляцца,
Майстэрству спеўнаму здзіўляцца,
Маімі ўменнямі натхняцца,
Любоўна ў вочы зазіраць,
Калі пачну спяваць на пяць.
Ніхто не будзе, як звычайна,
Рукамі вушы закрываць,
Ніхто не будзе больш збягаць,
А толькі слухаць і маўчаць,
Любоўна ў вочы зазіраць,
Маімі ўменнямі натхняцца,
Майстэрству спеўнаму здзіўляцца,
Калі пачну спяваць на пяць…

Пераклад з рускай — Паліна Маслянкова

Вершы ў перакладзе Яніны Голуб.

Першае выданне:

**Серія «Естетичне виховання.
Дитяча картинна галерея».**

Літературно-художнє видання

Ганна Сілівончик

Великі секрети

(*Російською мовою*)

Продюсер проекту *О. В. Симоненко*
Головний редактор *Д. В. Марков*
Коректор *Т. П. Кизима*
Літературний агент *Н. В. Григораш*
Зав. редакції *О. М. Костиря*
Художнє оформлення та макетування *О. В. Дзюба*

Підписано до друку 12.09.2011 р.
Формат 84x108/12. Папір офсетний. Друк офсетний. Гарнітура «Kabel BookC».
Ум.-друк. арк. 3,36. Наклад 2 000 прим.

Свідоцтво про внесення суб'єкта видавничої справи
до державного реєстру видавців, виготівників і розповсюджувачів
видавничої продукції ДК № 2678

Видавництво **МАЙСТЕР-КЛАС**
Головний офіс e-mail: kiev@masterclassbook.com
Редакція «МК-Харків» 61166, м. Харків, вул. Бакуліна, 11;
e-mail: kharkov@masterclassbook.com
«МК-НМВ» 61103, м. Харків, а/с 492;
(Навчально-методичний відділ) e-mail: nmo@masterclassbook.com